Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №6(51), Ч1, 2008

*УДК 882.6 (092)*

# Паэзія Заходняй Беларусі: мастацкія плыні

М. У. Мікуліч

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Развіццё паэзіі Заходняй Беларусі вызначалася ўзаемадзеяннем трох мастацка-стылёвых плыней – лірыка-апавядальнай, рамантычнай і духоўна-ірацыянальнай. Да лірыка-апавядальнай плыні належалі, напрыклад, Міхась Васілёк, Міхась Машара, Мікола Засім, Ніна Тарас і інш., да рамантычнай адносіліся Уладзімір Жылка, Максім Танк, Сяргей Крывец, Анатоль Іверс, да духоўна-ірацыянальнай – Казімір Сваяк, Наталля Арсеннева, Хведар Ілляшэвіч, Пётр Сяўрук…

У лірыка-апавядальнай мастацка-стылёвай плыні дамінаваў фактар адлюстравання рэчаіснасці, паказу з’яў і прадметаў, характарыстыкі пэўнага аб’екта. Духоўны свет асобы лірычнага героя раскрываўся тут у шчырым, натуральным, ураўнаважаным аповядзе, рэалістычна-аб’ектывізаваным вобразным малюнку, раскаваным рытміка-інтанацыйным ладзе верша. Напрыклад, творчасць М.Васілька заключала ў сабе сімбіёз аб’ектыўна-выяўленчага і суб’ектыўна-выразнага, апавядальна-гутарковага і лірычнага пачаткаў. У вершах другой паловы 20-х гадоў «Віхар», «З вясной», «Сілаў ня маю я...», «Там краіна мая» і іншых, якія склалі зборнік «Шум баравы» (1929), паэт адгукаўся на актуальныя падзеі грамадскага жыцця, сялянскай рэчаіснасці, з падкрэсленай увагаю, душэўнай цеплынёй і спачуваннем гаварыў пра цяжкі, гаравіты лёс, клопаты і турботы працаўніка-земляроба, раскрываў багаты і непаўторны свет яго думак і пачуццяў, надзей і спадзяванняў. Яны прыцягнулі ўвагу чытача натуральнасцю перажывання, нязмушанасцю расповяду аўтара, яго праўдзівымі і пераканаўчымі замалёўкамі і апісаннямі, пранікнёнымі і трапнымі назіраннямі і ацэнкамі, разнастайнасцю рытміка-інтанацыйнага гучання. У вершы «Там краіна мая» на аснове асаблівасцей мастацкага аналізу і асэнсавання канкрэтна-гістарычных рэалій заходнебеларускай сапраўднасці, жыцця і працы мужыка-селяніна М.Васілёк выявіў глыбокае разуменне сваіх духоўна-маральных і грамадзянска-патрыятычных задач і абавязку, намаляваў яркую, запамінальную, цэласную карціну, засведчыўшы добрае ўмельства выходзіць на шырокія сацыяльныя абагульненні.

Амаль адначасова з М.Васільком у заходнебеларускую літаратуру прыйшоў М.Машара. Змест і характар роздумаў і эмацыянальных узрушэнняў яго лірычнага героя таксама праўдзіва суадносіліся з рэальнай канкрэтыкай падзей і фактаў, з аб'ектыўным станам праблем і супярэчнасцей заходнебеларускай рэчаіснасці. Паэт сведчыў умельства дынамізаваць думку, канцэнтруючы яе ў даходлівым, празрыстым вобразе, разгортваць пластычна выразны настрой і перажыванне, акцэнтаваць увагу чытача на самым істотным і вызначальным у з’яве і працэсе, раскрываць паміж імі нечаканыя асацыятыўныя сувязі, ствараць свежыя, яскравыя і пераканаўчыя карціны і малюнкі жыцця сялянскага асяроддзя і прыроднага свету. Пры гэтым, у грамадстве яго найперш цікавілі рух, дзеянне, абуджэнне, а ў прыродзе — змена, пераходны стан, выспяванне іншай якасці, абнаўленне. Да прыкладу, лірычны герой верша «Родным гоням» поўніцца непадробнай радасцю і душэўным узрушэннем, лагодна назіраючы, як ранняю вясною, «Калі яшчэ голае ўсё», «рвецца да сьвету жыццё У творчых абняцьцях красы», «Як кожным паранкам туман, Бы белае стада гусей, Ад цёплых, ад мокрых палян Плывець у гару ўсё вышэй...» [1, с. 2].

Верш М.Машары падкрэслена традыцыйны для нашай літаратуры, просты, празрысты і ясны, звыклы для ўспрыняцця шырокага чытача і слухача. Гэта верш-апавяданне, верш-апісанне, верш-характарыстыка, у якім звычайна гутарка вядзецца ад трэцяй асобы, хаця і не заўсёды, радзей — верш-споведзь. Аб’ектыўна-выяўленчы пачатак выконвае ў ім вядучую, дамінуючую стылеўтваральную ролю.

Лірыка-апавядальная плынь з’яўляецца найбольш даўняй і распрацаванай у нашай літаратуры, тыповай для яе, але вядучае месца ў заходнебеларускім паэзіятворчым працэсе належала рамантычнай мастацка-стылёвай плыні. Тое было абумоўлена асаблівасцямі грамадска-сацыяльнага асяроддзя, разгортваннем у краі нацыянальна-патрыятычнага руху, народна-вызваленчай барацьбы. Творы прадстаўнікоў рамантычнай мастацка-стылёвай плыні характарызаваліся асаблівым, рамантычна-ўзвышаным, лірычна-пранікнёным, ладам светаадчування і мыслення героя, яго абвостраным успрыняццем народных бед і няшчасцяў, праблем і супярэчнасцей грамадска-сацыяльнай рэчаіснасці, нястрымным парывам у будучыню, да ідэалаў свабоды і справядлівасці, дабра і шчасця. Яны паэтызавалі высокія духоўна-маральныя каштоўнасці жыцця, поўніліся рамантычна-ідэалізаванымі вобразамі і карцінамі, вызначаліся драматычным зместам, інтэнсіўным рытміка-інтанацыйным гучаннем.

Варта адзначыць, што зместаваўтваральнае рэчышча рамантычнай мастацка-стылёвай плыні ў сваю чаргу ўключала ў сябе тры цесна звязаныя паміж сабой адгалінаванні: нацыянальна-рамантычнае, радыкальнае ці рэвалюцыйна-рамантычнае і сацыяльна-рамантычнае. Да першага з іх, напрыклад, належалі Леапалд Родзевіч, Уладзімір Жылка, Ігнат Дварчанін, да другога – Піліп Пестрак, Валянцін Таўлай, Максім Танк, да трэцяга – Анатоль Іверс, Алесь Дубровіч, Ганна Новік…

У творчасці прадстаўнікоў нацыянальна-рамантычнага напрамку рамантычны характар светаўспрымання, ідэалізаваныя вобразы і малюнкі, узвышаны лірычны пафас спалучаліся з асэнсаваннем драматычна-балючых старонак нацыянальнай гісторыі, пастаноўкай пытанняў духоўнага адраджэння Беларусі, яе незалежнасці.

У 1922 годзе пабачыў свет першы паэтычны зборнік Л.Родзевіча «Беларусь», у якім аўтар зрабіў смелую спробу «ў лірычных формах даць сінтэзу беларускага Быту» [2, с. 2], стварыў светлы, цёплы, рамантычна-ідэалізаваны вобраз сваёй Бацькаўшчыны. Сёння, з вышыні шматлікіх грамадска-сацыяльных змен і зрухаў, ён успрымаецца як пранікнёна-пяшчотная, усчуленая песня паэта пра родную маці-Беларусь, яе жыццёвыя сілы і патэнцыі, асновы, характар і перспектывы гістарычнай жыццядзейнасці беларускага народа, яго духоўна-свядомаснае і маральна-псіхалагічнае развіццё, як усхваляваная, шчырая і светлая мара аб іх годным і шчаслівым заўтрашнім дні. Зборнік добра ўвасобіў сам дух, каларыт, атмасферу складанага, драматычнага часу, нацыянальнага асяроддзя, абуджэння беларусаў ад векавечнага сну, пакоры і змірэння, выхаду на гістарычную арэну з высакароднай мэтай набыцця самавызначэння, волі і незалежнасці.

У вершах першай паловы 20-х гадоў — тых, якія ўвайшлі ў зборнік “Беларусь”, і тых, якія друкаваліся ў віленскіх і мінскіх перыёдыках і іншых выданнях, — Л.Родзевіч паэтызаваў сваю родную зямлю, характэрныя рысы беларускага менталітэту, такія, як чуласць і дабрыню, памяркоўнасць і працавітасць, багатыя залежы нацыянальна-культурнага вопыту мінулага і духоўна-эстэтычных традыцый, сцвярджаў актыўныя і дзейсныя метады і формы змагання за вольную і шчаслівую будучыню Радзімы і яе народа (“Беларуская казка”, “Мінуўшчына”, “Заклік”, “Белая музыка”, “Цяпер іх сіла — наша кроў…” і інш.).

Носьбітам лірычнай свядомасці У.Жылкі з’яўлялася ідэя абуджэння і разгортвання сацыяльна-палітычнай і духоўнай актыўнасці народа, грамадскага абнаўлення, беларускай дзяржаўнасці, што добра засведчыла паэма “Уяўленне” (1923). “На мапу Еўропы Ўзышоў Беларус, — натхнёна сцвярджаў паэт. — У лапцях лазовых, Па світцы ручнік, І светам Хрыстовым Зіяе аблік” [3, с. 138]. Яго лірычны герой дарэшты аддадзены стыхіі нацыянальна-вызваленчага руху, прасякнуты адчуваннем складанай і супярэчлівай прыроды грамадска-сацыяльных працэсаў, рэвалюцый і войнаў, якія прайшліся па беларускіх этнічных землях, усведамленнем сувязі і ўзаемаабумоўленасці гістарычных змен і пераўтварэнняў і народнай жыццядзейнасці. Ён поўніўся бязмежнай сыноўскай радасцю ад разумення, што пазнаў, здабыў Маці-Радзіму, Бацькаўшчыну-Беларусь, якая актыўна рэалізуе свае правы на духоўнае самасцвярджэнне, свабоднае развіццё ў часе і прасторы, становіцца “наймалодшай нацыяй” у кагорце народаў-суседзяў.

Паэт натхняўся багатым гістарычным мінулым Бацькаўшчыны, помніў “і веча звоны, І вольнасць роднай стараны” (“Мы любім даўнія паданні…”). Ён быў упэўнены, што “з ні-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

зін, балот З надзеяй ў шчаснасць дзён святлейшых Устане ўзбуджаны народ", бо "дух творчы ў Беларусі Жыве й змагае долі жах" [3, с. 27, 28]. Яго лірычны герой, якому некалі маці наказвала не забываць "Нашай долі і нядолі, Нашых пожняў, нашых хат" ("Маёй маці"), цвёрда верыў "Ў вялікі лёс і шлях Радзімае зямлі", у тое, што "Абуджаны народ быліц дазнае сказ — Узрушыць як адзін пры свеце бліскавіцы" ("Сёмуха").

Радыкальны ці рэвалюцыйна-рамантычны напрамак у развіцці заходнебеларускай паэзіі грунтаваўся на сцвярджэнні камуністычнай ідэі, падпольніцкага руху, жорсткіх форм народнага змагання, імкнення да глабальнай перабудовы жыцця. Ён культываваў рашучасць, бескампрамісныя метады і прыёмы дасягнення высокай мэты, услаўляў волю, самаахвярнасць, сілу духу і рэвалюцыйнага гарту. Да прыкладу, творчасць В.Таўлая апладнялася адмабілізаванай настроенасцю на рэвалюцыйнае змаганне, ахвярнае адстойванне чалавечай годнасці беларусаў, поўнілася рамантычным "духам бунтоўнасці", няскоранасці, супрацьстаяння засіллю. "Лагодны па натуры паэт, — падкрэсліваў У.Калеснік, — прымушае сваю музу пілаваць краты, крышыць муры, весці баявыя дружыны на барыкады, глядзець у вочы голаду і смерці. Суровыя малюнкі быццам нарысаваны вугалем на шурпатай турэмнай сцяне" [4, с. 4].

Як і многія іншыя аўтары, В.Таўлай распрацоўваў сімваліка-алегарычныя вобразы ночы, хмар, вясны, грому, сонца і інш., якія напаўняў глыбокім сацыяльна-рэвалюцыйным зместам, падпарадкоўваў вядучай ідэі сваёй творчасці — сцвярджэнню неабходнасці перагляду асноў грамадскага жыццеўладкавання, перабудовы свету пад кутом якасна новых метадалагічных прынцыпаў і маральных норм. "Радзее змрок… Наперад — скок. Мы пераможам — вер!, — заўпэўніваў яго лірычны герой. — Зара гарыць, пара стварыць Сусветны ССР" ("Дванаццаць год…"). Паэт мысліў высокімі крытэрыямі і катэгорыямі, маштабнымі паняццямі, яго верш дыхаў грамадзянскім тэмпераментам, бескампраміснасцю, шырокімі сацыяльнымі даляглядамі:

Гром, — загрымі! Віхор, — завый!
Пад бляск маланак агнявы
хай задрыжаць прасторы неба:
скрануць Зямлю з падвалін трэба! [5, с. 13]

У 30-я гады ярка заявіў пра сябе М.Танк (зборнікі "На этапах" (1936), "Журавінавы цвет" (1937), "Пад мачтай" (1938)). Яго паэзія вызначалася чысцінёй і свежасцю, непасрэднасцю ўспрыняцця свету, гуманістычна-чалавечай чуйнасцю, але ў той жа час і ўнутранай адмабілізаванасцю, грамадзянскай страснасцю, своеасаблівым драматычна-аптымістычным характарам мастацкага абагульнення. Гэта была паэзія чорных скіб, як падкрэсліваў М.Арочка, "шурпатых далоняў, незагойных ран, стогнаў у катоўнях" [6, с. 63], гневу і бунту, смелага выкліку, якая грунтавалася на тонкай назіральнасці і ўражлівасці, эмацыянальна-псіхалагічнай пранікнёнасці лірычнага героя, услаўленні высокіх праяў святла і красы ў прыродным свеце, грамадскім асяроддзі і душы чалавека. Характэрная летуценнасць, умоўна-рамантычная мройлівасць, душэўная высакароднасць спалучаліся у ёй з наступальнай бескампраміснасцю, рэвалюцыйным гартам, ахвярнай мужнасцю. З асаблівай выразнасцю гэта раскрылася ў вершах "Чорныя скібы", "Начная цішыня", "Спатканне", "Над Прыпяццю", "Песня кулікоў", "Паслухайце, вясна ідзе…" і інш.

Вялікае месца ў паэзіі М.Танка належала такім ёмістым сацыяльна-маральным катэгорыям, як матчына песня, родныя загоны, муры і краты, вясна-перамога, звон кайданаў, чорныя скібы, паднебныя шляхі, каласістае гора, жалезны вырай, этапныя дарогі, світальная зара, полымя волі, сталёвы сонечны паход і інш. Яны ўвасаблялі адметныя рысы грамадскага жыцця і прыродна-геаграфічнага ландшафту Заходняй Беларусі, ладу мыслення і філасофіі, духоўна-сацыяльнай свядомасці яе народа, раскрывалі характэрныя асаблівасці беларускага нацыянальнага лёсу. Гэта былі своеасаблівыя каардынаты прыгнечанага і занядбанага роднага краю паэта, у кантэксце якіх і разгортвалася жыццядзейнасць яго лірычнага героя.

Што датычыць сацыяльна-рамантычнага напрамку, дык ён вызначаўся звернутасцю да раскрыцця актуальных грамадскіх праблем і супярэчнасцей, сацыяльна-маральнага ўкладу жыцця ў Заходняй Беларусі, узаемаабумоўленасці ў ім канкрэтных з'яў і працэсаў, характэр-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

най лірыка-публіцыстычнай насычанасцю і ў той жа час выразнай стрыманасцю ўнутранага пафасу. Тыповы прадстаўнік гэтага напрамку А.Іверс намагаўся выйсці за межы адналінейных, прамых і выразных адчуванняў, аддацца патаемнаму і незвычайнаму, няўлоўным эмацыянальна-пачуццёвым парыванням і мэтаімкненням. Паэзія, творчасць былі для яго своеасаблівай альтэрнатывай змрочнай заходнебеларускай сапраўднасці, заснаванай на гвалце і несправядлівасці. Як сведчыць зборнік “Песні на загонах” (1939), вяскова-побытаваму свету, сялянскай рэчаіснасці з яе цяжкой штодзённай працай і шматлікімі клопатамі і турботамі А.Іверс супрацьпастаўляў «сонечны прастор», «камяністую шыр», «далі росныя», Млечны Шлях, зоры, што «мяцеляцца», рамантычны палёт да нязведанага. Паэт імкнуўся вершам «з сэрца» прывітаць «далі ў руністых каберцах», сыпнуць поўнай жменяй «буйных думак — росы, дзе туману воўна затуліла просінь». «Сонца азалоціць росы на загонах… — сцвярджаў ён. — Звоняць дні на дроце, звоняць, звоняць, звоняць…» («Звоняць дні…»).

Душа паэта шукала сябе ў лучнасці і ўзаемадзеянні з прыроднымі працэсамі — жывымі, рухомымі, зменлівымі, выяўляла сваю сутнасць праз адчуванне іх цэласнасці і гарманічнасці, высокага духоўна-маральнага зместу і ўзаемаабумоўленасці. Суадносячы прыроднае і грамадскае, спалучаючы пры гэтым прыватнае, асабістае і агульнае, сацыяльна значнае, А.Іверс раскрываў канфліктнасць стасункаў і ўзаемаадносін чалавека і рэчаіснасці, асобы і асяроддзя, выяўляў дысгармонію, драматызм жыцця.

Творчасць А.Іверса вызначаў стрыманы, можна нават сказаць, лагодны, пластычна-выяўленчы, прысумлены рамантызм.

У 30-я гады ў заходнебеларускай перыёдыцы друкаваліся вершы А.Дубровіча. Яны выяўлялі суб’ектыўны свет асобы, што жыла клопатамі і праблемамі сялянскага асяроддзя, бараніла ідэі сацыяльнай справядлівасці і свабоды, права на звычайныя чалавечыя радасці, малявалі вобраз рамантычнага будзіцеля шырокіх пластоў насельніцтва. А.Дубровіч «верыў у сілу паэтычнага слова» (М.Бельскі), заклікаў заходнебеларускага песняра сплаціць «свой доўг вялікі», адважна кінуць у свет «Усхваляваныя напевы» з тым, «Каб новых дзён яны засевам Ўзняліся з-пад штодзённых бед. Каб хваляю на буйнай ніве Яны плылі і ўшыр і ўздоўж…» («Усхваляваныя напевы...»). Ён паэтызаваў стоеныя залежы народнага духу і веры, вогненную стыхію нацыянальна-вызваленчага руху, высокія маральныя каштоўнасці змагароў за народнае шчасце, аддаючы перавагу лірыка-абагульненай вобразнасці, раскаванай асацыятыўнай метафорыцы, умоўным сродкам мастацкай выразнасці.

А што сабой уяўляла духоўна-ірацыянальная мастацка-стылёвая плынь? Яе развіццё было звязана з абуджэннем і ўзбуйненнем чалавечай асобы, узрастаннем вагі інтравертнага пачатку, паглыбленнем суб’ектыўнага фактару ў асэнсаванні жыцця, дыферэнцыяцыяй модусаў аўтарскага мыслення і перажывання. Адзін з пачынальнікаў гэтай плыні К.Сваяк сцвярджаў духоўную сутнасць быцця як аснову дабра, ісціны і красы ў сусвеце, гэтак званае “станоўчае ўсёадзінства”, якое ўтвараецца арганічнай паяднанасцю і ўзаемапранікненнем прыватнага і агульнага, матэрыяльнага і ідэальнага, прасторавага і часавага (зборнік “Мая ліра”). Яго мастацкае мысленне абумоўлівалася імкненнем да пераадолення зямнога і прыроднага пачаткаў, таго, што прынята разумець пад вызначэннем “фізічнага эгаізму”, жывілася дабратворнай энергіяй любові, верай у сілу і несмяротнасць духу, маральнае ўдасканаленне чалавека і гармонію сусвету. Шырокай грамадскай няпраўдзе, сацыяльнай несправядлівасці і нацыянальнаму ўціску, бедам і няшчасцям народнага асяроддзя паэт супрацьпастаўляў станоўчы рэлігійна-хрысціянскі ідэал, перастварэнне жыцця ў любові і веры ў Царства Божае, высокую Божую праўду і свабодную згоду і адзінства. Яго духоўна-мастацкія сентэнцыі звярталі на сябе ўвагу цэласнасцю асобы, глыбінёй і вынашанасцю абагульненняў і ацэнак і ў той жа час характэрнай унутранай плыннасцю, маральна-псіхалагічнай пластыкай (“Шчасце”, “З кнігі мудрасці” і інш.).

Вышэйшым сэнсам існавання К.Сваяк лічыў духоўнае жыццё з увасобленымі ў ім красой і гармоніяй, маральнасцю і верай, што патэнцыяльна супрацьстаяць уладзе граху і несправядлівасці, выступаюць у якасці неабходнай умовы і ідэальнага выніку развіцця грамадскіх адносін. Менавіта духоўнае жыццё з’яўляецца той субстанцыяй, якая надзелена абсалютным

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

зместам. Усе праблемы і супярэчнасці рэчаіснасці ён прапаноўваў вырашаць і пераадольваць сілаю любові, усёдаравання і ўсёпрымірэння, імкненнем да духоўна-маральнага прасвятлення матэрыяльнага быцця і свету, насычэннем іх дабром, красой і ісцінай. К.Сваяк прапаведаваў аб’яднанне ўсіх і ўсяго на аснове імя і духа Хрыстова, сцвярджаў ідэю ўсеагульнага ўваскрэсення. Услед за многімі сваімі папярэднікамі і сучаснікамі паэт напаўняў гэтую ідэю ёмістым духоўна-сацыяльным зместам, звязваў яе з неабходнасцю абуджэння і актывізацыі грамадска-патрыятычнага руху, стваральнай дзейнасці шырокага працоўнага асяроддзя, адраджэннем Беларусі. Лірычны герой яго верша “Ad te levavi…” звяртаўся да Бога з тым, каб Ён спаслаў змілаванне над беларусім людам, “што поўны нядолі, Бо ўжо-ж ён просіць даўно змертвыхстаньня, Каб выйсьці з крыўды, з грэху і няволі” [7, с. 8]. “Чужынец люд Твой аддаў на пакусу, Каб з яго сэрца выгнаць Цябе, Божа…” — чытаем у творы. Ён прасіў Бога “зорам сваей моцы” скрышыць “нячыстых працу рук паганых”, збудзіць паднявольны, згараваны люд “На труд свабодны, на ласку спакою”, абагаславіць яго на дабро і шчасце [7, с. 8].

У рэчышчы духоўна-ірацыянальнай плыні плённа працаваў Х.Ілляшэвіч. Зборнікі паэта “Веснапесні” (1929), “Зорным шляхам” (1932) і “Захварбаваныя вершы” (1936) сведчаць пра тое, што яго мастацкая свядомасць вызначалася звернутасцю да міфалагічных, духоўна-метафізічных асаблівасцей народных вераванняў і ўяўленняў, якія прадугледжвалі адзінства і цэласнасць складаных жыццёвых працэсаў, характэрную светацэнтрычнасць, сувязь усяго з усім, узаемаабумоўленасць і ўзаемазалежнасць, ідэальную раўнавагу шматлікіх з’яў і прадметаў. Ён ухіляўся ад прамога адлюстравання рэчаіснасці, асэнсавання грамадска-сацыяльных праблем і супярэчнасцей, аддаючы перавагу іх душэўна-псіхалагічнаму абжыванню, раскрыццю ўнутранага свету лірычнага героя, засяроджанага на спасціжэнні існага, прасвятленні абсалютнага сэнсу. З’явы і працэсы навакольнага асяроддзя паўставалі ў свядомасці паэта, галоўным чынам, як пэўныя душэўна-пачуццёвыя дзеянні, эмацыянальна-псіхалагічныя малюнкі. У вершы “Я не знаю...” ён падкрэсліваў наступнае: “Быццам жрэц словаў ціхіх, пакорных, Я закляцьце раблю над імі, Каб у вершы – Словаў узоры Зьзялі пацеркамі дарагімі” [8, с. 13].

Духоўны светапогляд Х.Ілляшэвіча ў многім характарызаваўся асаблівасцямі ідэальнага пачатку, аб чым пераканаўча сведчаць вершы “Часамі ў душы маёй дзіўнай мэлёдыяй...”, “Вечар лашчыцца, быццам даль...”, “Сонца гразне ў чырвоны кісель...”, “Ноч прыйшла туманная...”, “Казка”, “Музыка” і інш. Чытаючы іх, мы бачым, што таямнічая і загадкавая душа свету рэалізавала сябе і ў тым, як “Мігае лямпа. Ноч маўчыць... Бязьлісты, голы сад шуміць...” (“Штрых”), і ў тым, як “Каля рэчкі... агнямі сінімі Забаўляецца вечар – змрок...” (“Навакол муры – простыя лініі...”), і ў тым, як “Ў каласы месяц-серп задзылінкаў – І вячорны вызваньвае псальм Пацямнеўшы мурожнік – клінкер...” (“Казка”). Буднёвыя працэсы і рэчы навакольнага асяроддзя набывалі ў Х.Ілляшэвіча незвычайнае, ірэальнае, чарадзейна-казачнае выяўленне, адухоўлены змест. У той жа час мройліва-зыбкія, містычныя карціны і вобразы, наяўнасць якіх абумоўлівалася палётнасцю фантазіі аўтара, інтуітыўна-пачуццёвым успрыняццем свету, атрымлівалі ў яго прадметна-рэчыўнае напаўненне, рэалістычную афарбоўку. Дастаткова часта вобразна-метафарычны малюнак паэта разгортваўся такім чынам, што ў ім цяжка было распазнаць, дзе заканчваецца адно і пачынаецца другое:

Дрэвы шапочуць у боскай драмоце,
Зоркі гарацъ, зачапіўшысь ў галінах,
Пар лёгкаўздымны кадзіць на балоце,
Таюць ў начы ціхасьпеўныя гімны...
Гэта малітвы к прастору – Сусьвету
Ў сьветла-пяшчотным зямлі прабуджэньні...
Быццам крылатыя казкі-прыветы,
Быццам цудоўныя сьпевы-тамленьні...
Слухай... Маўчы... [9, с. 60]

Паэзія Заходняй Беларусі выяўляла ўвесь спектр духоўна-сацыяльнага жыцця чалавека і грамадства. Яна прадуцыравала і тыя мастацка-стылёвыя плыні і напрамкі, якія па вядомых ідэалагічных прычынах не маглі атрымаць свайго развіцця ў беларускай савецкай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Abstract.** The paper gives an outline of the development of poetic genres in Western Belarus. This process is marked by the interaction of three stylistic trends: lyrical-narrative poetry, romantic and spiritual-irrational poetry. Each of these trends is studied and analyzed.

**Літаратура**

1. Машара, М. Малюнкі / М. Машара. – Вільня, 1928.
2. І.А. // Наша будучына. – 1923. – 6 студзеня.
3. Жылка, У. Выбраныя творы / У.Жылка. – Мн., 1998.
4. Калеснік, У. Шляхі сацыялістычнай паэзіі // Літаратура і мастацтва. – 1958. – 17 верасня.
5. Таўлай, В. Творы / В.Таўлай. – Мн., 1961.
6. Арочка, М.М. Максім Танк: Жыццё ў паэзіі / М.М.Арочка. – Мн., 1984.
7. Сваяк, К. Мая ліра / К.Сваяк. – Мн., 1993.
8. Ілляшэвіч, Х. Я не знаю // Калосьсе. – 1935. – №1.
9. Ільляшэвіч, Х. Зорным шляхам / Х.Ільляшэвіч. – Вільня, 1932.

Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Поступило 15.10.07

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ